# ПРАБЛЕМА ПОЛЬСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ У БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІХ АДНОСІНАХ У 1970-80-Я ГАДЫ

**Д. А. Драбовіч[1)], У. Е. Снапкоўскі[2)]**

*[1)] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
Мінск, Беларусь, danu1ldro06@gmail.com
[2)] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
Мінск, Беларусь, snap@bsu.by*

Вывучэнне гісторыі нацыянальных меншасцей адыгрывае ключавую ролю ў разуменні разнастайнасці культурнай спадчыны і шматграннасці грамадства. Гэта важна для захавання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці і разумення сацыякультурнай дынамікі. У артыкуле разгледжаны стан і асноўныя тэндэнцыі развіцця польскай нацыянальнай меншасці ў БССР і беларускай -у ПНР у 1970-1980-я гг. Аўтары прааналізавалі колькасныя змены абедзвюх нацыянальных меншасцей і ўмовы іх нацыянальна-культурнага развіцця. Гэта дазволілі адлюстраваць розніцу ў іх грамадзянскім і палітычным статусе ў БССР і ПНР, асабліва адносна веравызнання. На living становішча палякаў у Беларусі і беларусаў у Польшчы моцны, вырашальны ўплыў аказвалі сацыяльна-палітычныя сістэмы, унутры якіх яны знаходзіліся, Гэта праяўлялася і ў асімітрычным характары супрацоўніцтва БССР і ПНР.

***Ключавыя словы:*** польская нацыянальная меншасць; беларуская нацыянальная меншасць, беларуска-польскія адносіны; перапісы насельніцтва; грамадска-палітычнае жыццё; асіміляцыя; адукацыя.

# THE PROBLEM OF POLISH AND BELARUSIAN NATIONAL MINORITIES IN BELARUSIAN-POLISH RELATIONS IN THE 1970S-80S

**D. Drabovich[a], U. Snapkouski[b]**

*[a] Belarusian State University,
Minsk, Belarus, email: danu1ldro06@gmail.com
[b] Belarusian State University,
Minsk, Belarus, snap@bsu.by*

The study of the history of national minorities plays a key role in developing an understanding of the diversity of cultural heritage and the multifaceted nature of society. It is important for preserving culture and understanding socio-cultural dynamics. The publication will examine the main trends and the situation of the Polish national minority in the BSSR and the Belarusian national minority in the Polish People's Republic in the 1970s and 1980s. The problem of the research is the asymmetry of co-operation between the two

countries, the difference of political systems. The aim of the work is to determine the standard of living of national minorities in the time under consideration. To achieve the goal, such tasks as a comprehensive description of the Polish minority, establishing the position of the Belarusian minority in the Polish People's Republic were set.

***Keywords:*** Polish national minority; Belarusian national minority; Belarusian-Polish relations; population censuses; social and political life; assimilation; education.

У 1970-1980-я гады ў СССР працэс істотнага дапаўнення дзяржаўных і грамадска-палітычных устаноў, а таксама сфер культуры, навукі, адукацыі і іншых абласцей нацыянальнымі меншасцямі працаваў як праз цэнтралізаванае размеркаванне, накіраванае на замяшчэнне ключавых пасад савецкімі і партыйнымі кадрамі, якія праяўлялі лаяльнасць да СССР і КПСС; так і праз добраахвотны прыезд замежных спецыялістаў і асоб, якія жадалі ўнесці свой уклад у развіццё разнастайных сфер жыцця краіны.

Што з сябе ўяўляла польская меньшасць у БССР? У даследаваны перыяд у БССР было праведзена тры перапісу насельніцтва: у 1970, 1979, 1989 гг. Згодна іх дадзеных, у 1970 г. у БССР пражывала 382 600 асоб польскай нацыянальнасці (4,25% ад агульнай колькасці насельніцтва), у 1979 г. – 403 169 асоб (4,23%), да 1989 г. лічба пабольшылася – 417 720 асоб (4,11%) [1, с. 214]. Нягледзячы на колькасць палякаў, іх удзельная вага паменьшылася на 0,14% за 19 гадоў. Такое зніжэнне колькасці палякаў у Беларусі тлумачыцца якнатуральнымі працэсамі асіміляцыі (Гэтага ўжо не было), так і зменай самавызначэння многіх каталікоў, якія раней адносілі сябе да палякаў. Паступова яны пачалі аддаваць перавагу ўласнаму самавызначэнню як беларусаў, бо паводле перапісаў 1970, 1979 і 1989 г., большасць палякаў у Беларусі, адпаведна 76,4%, 74% і 63,9%, называлі беларускую мову сваёй роднай [2, с. 147].

Для вывучэння заяўленай тэмы трэба адзначыць не толькі агульную колькасць, але ўдзел польскай меншасці ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі, у тым ліку колькасць палякаў у складзе Камуністычнай партыі Беларусі. Цікава, што іх агульная колькасць з 1950 г. да канцы 1980-х гг. узрастала: калі ў 1955 г. у КПБ было толькі 828 палякаў, то ўжо ў 1970 г. – 7050 палякаў [2, с. 185]. Падчас 1980-х гг. палякі займалі пасады інспектараў ЦК КПБ, загадчыкаў аддзелаў абкамаў КПБ, інструктараў абкамаў, першых сакратароў гаркамаў і райкамаў [2, с. 198]. Што да эканомікі, то ў 1970-я гг. у БССР у сельскай гаспадарцы палякаў было 34,3%, сферы адукацыі – 6,1%, мясцовай адміністрацыі – 0,2% [2, с. 206], але ў навуцы – толькі 0,1%.

Увогуле, становішча палякаў у БССР можна ахарактарызаваць як становішча пошука, бясконцых спроб знайсці тое, што магло б стаць адзіным цэлым для кожнага паляка ў Беларусі, стаць лакмусавай паперкай для вызначэння нацыянальнай прыналежнасці: вялікае значэнне палякі надавалі рэлігіі, г. зн. каталіцтву. Асаблівасць перыяду 1970-х і 1980-х гг. заключалася ў тым, што ў палітыцы СССР ужо не праводзіўся такі заўзяты курс супраць рэлігій; маецца значна больш дадзеных аб веравызнанні насельніцтва, нягледзячы на гэта ўсё ж вялікі працэнт хрысціўся выкрытую, але дакладных лічбаў мы наўрад ці пазнаем. Другая вялікая асаблівасць – гэта абранне кракаўскага архіепіскапа К.Вайтылы на пасаду Папы Рымскага ў кастрычніку 1978 г., а таксама візіты Яна Паўла ІІ ў ПНР ў чэрвені 1979 і 1983 гг., якія зрабілі вялікае ўражанне на палякаў і польскую дыяспару ў суседніх краінах. Гэтыя падзеі сталі каталізатарам актывізацыі дзейнасці польскіх місіянерскіх арганізацый на Гродзеншчыне пад эгідай каталіцкай царквы.

Таксама на рост самасвядомасці палякаў у БССР уплывала арганізаваная ў 1980 г. ў Гданьску «Салідарнасць», якая змагалася за дэмакратызацыю Польшчы і дзейнічала пры непасрэднай падтрымцы з боку Касцёла. У 1986—1987 гг. Інстытут філасофіі і права Акадэміі навук БССРі правёў цікавае даследаванне, згодна з якім каталікі свядома разглядалі каталіцкую веру як выяўленне польскага нацыянальнага духу і прыналежнасці да польскай нацыі [3, с. 106].

Вялікай часткай грамадскага жыцця з'яўляецца адукацыя. З адукацыяй польскай меншасці ў БССР, у першую чаргу ў заходняй частцы рэспублікі, было цяжка, бо галоўнае пытанне заключалася ў адкрыцці польскіх школ у Беларусі. Ліквідацыя польскіх школ у пасляваенныя гады прывяла да таго, што адукацыя на роднай мове стала практычна недаступнай, таму да сярэдзіны 1980-х гг. нацыянальна-культурнае жыццё палякаў у значнай ступені засяроджвалася ў рамках рэлігійных таварыстваў і суполак. Часцей за ўсё пытанне пра школы на роднай мове ўзнімалі ў Гродзенскай вобласці. Згодна статыстыцы, сярод самых распаўсюджаных пытанняў да лектараў Гродзенскай вобласці ў 1973 г. было пытанне: "Чаму ў Гродна няма польскіх школ?" [1, с. 211].

Варта адзначыць і такія значныя падзеі ў грамадска-палітычным жыцці, як Дні польскай культуры ў БССР у 1958, 1964, 1972, 1976 гг. У 1970-я гг. Дні праводзіліся два разы (у 1972, 1976 гг.). Але ж праходзілі яны выключна па загадзя складзеных планах і пад моцным кантролем партыйных органаў [4, с. 296; 5, с. 165-167, 171-173]. Так, беларускі гісторык В. Мазец прыйшоў да высноў, што такія дні культуры мелі "ідэалагічна-прапагандысцкія мэты, не маглі зрабіць істотнага ўплыву на ўзровень самасвядомасці палякаў у БССР" [1, с. 216].

Што тычыцца становішча беларускай меншасці ў ПНР у 1970-1980-я гг., то адну яе частку складалі прадстаўнікі працоўнай і палітычнай эміграцыі беларусаў 1930-1950 х гг. і іх патомкі. Аднак яе аснова была закладзена рашэннямі “вялікай тройкі” ў гады Другой сусветнай вайны і першыя пасляваенныя гады, калі адбыліся змены ў вызначэнні савецка-польскай мяжы. Як вядома, у 1944-1945 гг. Беластоцкая вобласць і частка Белавежскай пушчы (тры раёны Брэсцкай вобласці) былі перададзены са складу БССР у склад Польскай Рэспублікі. Такім чынам значная кольскасць беларусаў апынулася за межамі сваёй метраполіі і стала нацыянальнай меншасцю ў Польшчы. Беластоцкае ваяводства (зараз Падляшскае ваяводства) пераўтварылася ў цэнтр беларускага арганізаванага жыцця ў польскай дзяржаве [5, с. 120-123]. У выніку перасяленняў (эвакуацыі насельніцтва) з тэрыторыі БССР у Польшчы ўзнік і другі цэнтр, куды перамяшчаліся беларусы: гэта Заходняя Польшча і Памор’е (Памеранія). Частка беларусаў рассялялася па іншых раёнах Польшчы (цэнтр краіны каля Варшавы, поўдзень каля Кракава і інш.).

У 1970-80-я гг. у сувязі з адсутнасцю права на эміграцыю з СССР колькасць пераездаў з БССР у ПНР практычна была роўная нулю. І толькі ў самым канцы 1980-х гг. пагаршэнне экалагічнай і сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў Беларусі і змяненне заканадаўства аб выездзе за мяжу паспрыялі павелічэнню беларускай дыяспары ў ПНР, якая з 1989 г. пачала называцца Рэспублікай Польшчай [6, с. 91]. Гэтым чынам, агульная колькасць беларусаў у ПНР у 1970-1980 гг. па розным дадзеным склала да 300 тысяч асоб (чаму няма спасылкі?).

У 1976 г. Цэнтральны камітэт Польскай аб'яднанай рабочай партыі прыняў рашэнне аб дасягненні маральна-палітычнага адзінства ў польскім грамадстве, што аказала негатыўны ўплыў на дзейнасць аб'яднанняў, якія прадстаўлялі інтарэсы беларускай меншасці. У 1980-я гг. узніклі і сталі актыўна функцыянаваць Беларускі саюз студэнтаў, Беларускі музей у Гайнаўцы, а таксама з'явіліся некалькі беларускіх выдавецтваў і перыядычных выданняў. Ужо да пачатку 1990-х гг. у польскіх школах беларускую мову вывучалі 3677 вучняў, а ў беларускіх ліцэях у Гайнавецы і Бельску вучылася 630 навучэнцаў [7, с. 7].

Даследаванне беларускага і польскага грамадстваў і іх этнічнага складу дапамагае зразумець праблему нацыянальных меншасцей у беларуска-польскіх адносінах. Сутнасць праблемы зводзіцца да сістэмнага крызісу , у якім гэтыя грамадствы і дзяржавы (савецкая і сацыялістычная ПНР-аўская) знаходзіліся. “Асіметрычнае супрацоўніцтва” дзвюх палітычных сістэм не дазваляла краінам цалкам вырашыць вострыя пытанні, якія падымаліся толькі падчас вельмі рэдкіх

візітаў ці сустрэч (напрыклад, візіт Я. Гамулкі ў Мінск у 1958 г., сустрэча П.Краўчанкі з К.Скубішэўскім у 1990 г.). У даследаваны час у адной краіне (БССР) перапіс насельніцтва нават не ўключаў пытанне пра рэлігійную прыналежнасць, у той час як у суседнюю дзяржаву, дзе больш за 90 % начельніцтва складалі каталікі, рэгулярна наведваўся Папа Рымскі.

## Библиографический список

1.*Мазец, В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. — Мінск : Национальный архив Республики Белаурсь.

2.*Пушкін, І. А.* Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.) : / І.А. Пушкін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 319 с.

3.Актуальныя пытанні беларуска-польскіх адносін: да 20-годдзя Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча аб добрасуседстве, сяброўстве і супрацоўніцтве ад 23 чэрвеня 1992 г. : матэрыялы беларус.-пол. круглага стала / рэдкал. : В. Г. Шадурскі (навук. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2012. — 115 с.

4.*Вялікі, А. Ф.* Палякі ў Савецкай Беларусі: «Дваістыя стандарты» нацыянальнай палітыкі КПБ (1944—1991 гг.) / А. Ф. Вялікі // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф., Мінск, 6—7 снежня 2001 г. — Мінск: Дэполіс, 2001. - 214 с.

5.*Снапкоўскі, У. Е.* Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918-2017 гг.: / У. Е. Снапкоўскі. - Мінск: БДУ, 2017. - 287 с.

6.*Остроух, Ю. В.* Этапы формирования белорусской диаспоры в Польше в XX в. / Ю. В. Остроух // Копытинские чтения – III : сборник статей Международной научно-практической конференции, Могилев, 28 февраля - 1 марта 2019 г. / под общ. ред. А. М. Авласовича. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2020. – С. 90–92.

7.*Кавалевіч, М.* Беларускае школьніцтва ў Польшчы і польскае на Берасцейшчыне // Беларуска-польскае ўзаемадзеянне ў галіне культуры: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі / рэд.: В. Лашук і інш. — Брэст: Талер, 1993 — С. 7 — 10.